# ГІСТОРЫЯ КАФЕДРЫ АГУЛЬНАЙ ХІРУРГІІ

Заснавальнікам кафедры быў **Міхаіл Паўлавіч Сакалоўскі** (узначальваў кафедру ў 1922-24гг.), вучань С.І.Спасакукоцкага. Прафесар М.П.Сакалоўскі быў запрошаны рэктарам БДУ са Смаленску. Першы загадчык кафедры, ён праводзіў вялізную арганізацыйную, лячэбную і педагагічную работу, чытаў лекцыі па агульнай і аператыўнай хірургіі, стаматалогіі. Ён укараняў метады хірургічнага лячэння язвеннай хваробы шлунка і дванаццаціперснай кішкі (выканаў першую ў рэспубліцы рэзекцыю шлунка), гідрацэфаліі, імпатэнцыі, касцёва-сустаўнага туберкулезу, вострых хірургічных захворванняў органаў брушной паражніны.

**Рубашоў Савелі Міронавіч** (1883-1957) быў запрошаны з Ленінграда і загадваў кафедрай у 1924-34 гг. З яго непасрэдным удзелам распрацоўваліся пытанні дыягностыкі і лячэння вогнестрэлавых ран, ілеусу, а таксама уралагічнай і анкалагічнай паталогіі. Ён быў першым кіраўніком Рэспубліканскага з’адзіночання хірургаў. Яму ж першаму было прысвоена званне заслужанага дзеяча навукі. У 1932 годзе С.М.Рубашоў напісаў першую кнігу для хірургаў на беларускай мове «Клінічная хірургія”. Пад яго кіраўніцтвам былі абароненыя 7 доктарскіх і 19 кандыдацкіх дысертацый.

Пасля ад’езду С.М.Рубашова кафедру ўзначаліў **Я.В.Корчыц**, які абараніў доктарскую дысертацыю ў 1927 годзе. Пад яго кіраўніцтвам працягвалася вывучэнне анкалагічнай паталогіі, прыроды спленамегаліі, туберкулезу легкіх, эндэмічнага зоба. Ён арганізаваў ў Мінску супрацьзобную станцыю і анкалагічныя пункты ва ўсіх буйных гарадах Беларусі. Я.В.Корчыц першым быў абраны членам-карэспандэнтам Беларускай Акадэміі навук.

З 1937 па 1949 год (выключаючы 1941-42 гг.) загадчыкам кафедры агульнай хірургіі працаваў **У.В.Бабук**. Асноўнай тэматыкай кафедры былі трансфузійны шок, метад пераліванння трупнай крыві, унутрыартэрыяльныя гематрансфузіі ў мэтах рэанімацыі, раневая інфекцыя, пачалося лячэнне апёкавых хворых. Былі абаронены 2 доктарскія і 22 кандыдацкія дысертацыі. Прафесар У.В.Бабук быў дырэктарам Інстытуту ўдасканалення ўрачоў, старшынёй Рэспубліканскага з’адзіночання хірургаў. Яму было прысвоена ганаровае званне Заслужанага дзеяча навукі.

Ў 1949-55 гг. кафедру агульнай хірургіі ўзначаліў **П.М.Маслаў**. Хірургічнае майстэрства выхаванца школы П.А.Герцэна, С.І.Спасакукоцкага і А.В.Вішнеўскага расквітнела на Беларусі. Клініка шырока ўводзіла аперацыі на легкіх, органах брушной паражніны, шчытападобнай залозе, канцавінах, органах мочавыдзяляльнай сістэмы, анкалогіі, пры жоўцекаменнай хваробе, вострам холецысціце, апендыцыце, ілеусе. П.М.Маслаў падрыхтаваў 2 дактароў і 32 кандыдата навук, выдаў 2 манаграфіі і 68 навуковых прац. Сярод яго вучняў – выдатныя хірургі і педагогі прафесары М.Я.Філіповіч, В.Г.Астапенка, А.В.Шотт, Л.В.Аўдзей.



Вучні прафесара П.М. Маслава. 1 рад, злева направа: прафесары Філіповіч М.Я., Астапенка В.Г., Шотт А.В., Аўдзей Л.В., дацэнт Стрыжеўскі В.Б.

У 1955-56 гг. загадчыкам кафедры працаваў дацэнт **Мікалай Іванавіч Бобрык**. Ён быў абраны у 1948 годзе першым дырэктарам анкалагічнага дыспансэра, галоўным анколагам Міністэрства аховы здароўя Беларусі. Працягваў традыцыі сваіх настаунікаў і папярэднікаў. Раптоўная хвароба у 1956 годзе не дазволіла раскрыцца ўсім талентам гэтага выдатнага чалавека і хірурга.

У 1956, 1959-60 гг. кіраўніком кафедры быў дацэнт **Грэйман А.А.** Ен дасканала вывучыў паталогію шчытападобнай залозы у БССР, абараніўшы у 1960 годзе доктарскую дысертацыю. 1961 годзе ён ўзначаліў 2ю кафедру гаспітальнай хірургіі Мінскага дзяржаўнага медычнага інстытута.

З 1957 па 1959 гг. загадчыкам кафедры працаваў заслужаны дзеяч навукі РСФСР прафесар **Раўноў А.С.** Шмат увагі ён аддаваў пытанням пералівання крыві, лячэнню апёкавай хваробы, траўмы органаў брушной і грудной паражнін. Каля 30 прац ён прысвяціў пытанням лячэння ран пад уздзеяннем радыяцыі і хімічных рэчываў. Выдаў рэкамендацыі для ваенных ўрачоў па лячэнню апечаных. Пад яго кіраўніцтвам абаронены 5 кандыдацкіх дысертацый. У 1959 годзе быў абраны намеснікам дырэктара інстытута грудной хірургіі Акадэміі медычных навук СССР.

У 1960-70 гг. кафедру узначаліў прафесар **Ц.Я.Гніларыбаў** – заслужаны дзеяч навукі УССР, выхаванец школы Багараза. Кола яго інтарэсаў уключала пластычную хірургію і органазахавальныя аперацыі, а таксама перасадку органаў, тканак, эндакрынных залоз. Работа па перасадке касцявога мозгу адзіным блокам з грудзінай атрымала бронзавы медаль на ВДНГ СССР. Заснаваў і арганізоўваў працу апёкавага цэнтра ў Мінску, заснаваў лабараторыю забора і кансервавання донарскіх органаў і тканак. Пад яго кіраўніцтвам былі абароненыя 3 доктарскія і 15 кандыдацкіх

дысертацый – только на Беларусі. За ўвесь час працы на Беларусі і Украіне ён падрыхтаваў 11 дактароў і 39 кандыдатаў, выдаў 4 манаграфіі і 250 прац па актуальных пытаннях хірургіі.

У 1970-78 гг. кафедрай загадваў дацэнт **Арцішэўскі Л.І.** Ён працягваў традыцыі П.М.Маслава, М.І.Бобрыка. А.А.Грэймана, А.С.Раўнова, Ц.Я.Гніларыбава. За гэты перыяд супрацоўнікі кафедры абаранілі 2 доктарскія і 4 кандыдацкія дысертацыі. За арганізацыю спецыялізаваных амбулаторных прыёмаў апечаных хворых дацэнт Арцішэускі Л.І., Булай П.І., Дэмідчык Е.П. былі ўзнагароджаны бронзавым медалем ВДНГ СССР у 1974 годзе.

У 1978-90 гг. загадчыкам кафедры быў прафесар І**.Ф.Барадзін**. Пытанні шлункава-кішэчнай паталогіі, распрацоўка метадаў пластыкі рэцыдзіўных вентральных кілаў (грыж), экстрэнная дапамога. Пытанні лячэння колапрокталагічных хворых займаюць вядучае месца ў навуковых даследваннях і рабоце калектыва кафедры. За гэты час падрыхтавана і абаронена 8 кандыдацкіх дысертацый, напісаны 2 манаграфіі, прапанована 21 рацыяналізатарская прапанова.

З 1991 года да 2009 г. кафедрай загадваў прафесар Г.П.Рычагоў.

Калектыў кафедры пад кіраўніцтвам Г.П Рычагова займаўся пытаннямі хірургічнай гастраэнтералогіі, агульнай і экстрэннай хіругіі, прокталогіі і лячэння остэаміелітаў. За гэты час на базе кафедры – 3 ГКБ – адчыніліся Рэспубліканскі цэнтр хірургічнай гастраэнтералогіі, Мінскія гарадскія цэнтры прокталогіі і остэаміелітаў, арганізаваны цэнтр хірургічнай дапамогі цяжарным жанчынам з экстрэннай хірургічнай паталогіяй органаў брушной паражніны.

Супрацоўнікі займаліся распрацоўкай і ўкараненнем новых лазерных тэхналогій ў хірургіі, тэлеэндавідэахірургіі, органазахавальных і малаінвазіўных метадаў у хірургічнай гастраэнтэралогіі. У педагагічным працэсе шырока прымянялася і працягвае прымяняцца камп’ютэрнае тэставанне студэнтаў.

У 2009 годзе на месца загадчыка прызначаны прафесар **С.А. Алексееў**.



Прафесар Сяргей Аляксеевіч Алексееў (фота 2016 года)



Калектыў кафедры у 2009 г. Стаяць: дацэнты В.С.Дзеркачоў, А,І.Лемешэўскі, А.М.Голуб, прафесар С,А.Алякееў, асістэнты С.В.Новікаў, А.А.Амельчэня, дацэнт Н.Е.Нікалаеў, асістэнты В,А.Гінюк, П.П,Кашэўскі, дацэнт А.Н.Нехаеў. Сідзяць: лабарант Л.І.Сапленкова, Н.Г.Марчук, дацэнт А.А.Безвадзіцкая, прафесар Г.П.Рычагоў, лабаранты С.Г.Скакун, І.З.Бельская

Больш чым за 90 год працы на кафедры абаронена 12 доктарскіх и 62 кандыдацкія дысертацыі па хирургіі. Апублікавана 33 манаграфіі, 6 падручнікаў, больш за 3000 артыкулаў у журналах. Атрымалі атэстаты 33 прафесары ды дацэнты, скончылі аспірантуру больш за 40 чалавек. У практыку аховы здароўя укаранены 62 вынаходніцтва, прааперыравана больш за 200 тыс пацыентаў з разнастайнай хірургічнай паталогіяй. За апошні перыяд (5 год) абаронена 6 кандыдацкіх дысертацый:

У 2009 г. абаронена кадыдацкая дысертацыя сушукальнікам кафедры ВПХ Сакаловым Ю.А. "Коррекция метаболических нарушений при распространенном перитоните" (навуковы кіраўнік– праф. Аляксеев С.А.).

У 2012 годзе абаронена кадыдацкая дысертацыя асыстэнта кафедры агульнай хірургіі Гінюка В.А. «Фотодинамическая и фоторегуляторная терапия в комплексном лечении острого парапроктита» (клініка-эксперыментальнае даследванне), навуковы кіраўнік – прафесар Рычагоў Г.П.

У 2013 годзе абаронена кадыдацкая дысертацыя асыстэнта кафедры агульнай хірургіі Амельчэня О.А., «Диагностика и лечение острого аппендицита у беременных», навуковы кіраўнік – прафесар Рычагоў Г.П.

У 2013 годзе абаронена кадыдацкая дысертацыя Дароніна М.В. "Медико-биологическая и клиническая эффективность отечественного композиционного гемостатического средства на основе естественных факторов свертывания крови «фибриностат»" (клініка-эксперыментальнае даследванне), навуковы кіраўнік дацэнт (зараз прафесар) Бардакоў В. Н.

У 2014 годзе абаронена кадыдацкая дысертацыя сушукальнікам кафедры ВПХ и агульнай хірургіі Тарасенко А.В. «Клинико-иммунологические особенности диагностики и лечения деструктивного панкреатита», навуковы кіраўнік– прафесар Аляксеев С.А.

У 2015 годзе абаронена кадыдацкая дысертацыя асыстэнта кафедры агульнай хірургіі Кашеўскім П.П. ««Прогнозирование и профилактика гнойно-воспалительных осложнений у пациентов с механической желтухой неопухолевого генеза», навуковы кіраўнік– прафесар Аляксееў С.А.

Апошнім часам штогод кафедральныя супрацоўнікі кансультуюць больш за 15 тысяч пацыентаў.

На кафедры выкладаюць агульную хірургію студэнтам 2 і 3 курсаў лячебнага, педыятрычнага, ваенна-медыцынскага и медыцынскага (іншаземных студэнтаў) факультэтаў, хірургічныя хваробы - студэнтам III курса стаматалагічнага и III - IV курсаў медыка-прафілактычнага факультэтаў, а також прадмет першая дапамога – студэнтам 1 курса лячебнага факультета. Выкладанне агульнай хірургії, хірургічных хваробаў і першай дапамогі таксама пачало весціся на ангельскай мове з 2012 года.

Вялікая увага падаецца на карысць падрыхтоўкі маладых дактароў і даследвацеляў. Рэгулярна мадэрнізуюцца навучальныя праграмы для стуэантаў 1-4 курсаў, заснаваны і праводзіцца электыўны курс "Актуальныя пытанні хірургічнай інфекцый" і "Колапрокталогія" для субардынатараў.

Сучаснасць. Супрацоўнікі кафедры ўдасканальваюць існыя і прапануюцо новыя методыкі прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння хворых на разнастайную хірургічную

паталогію ў аддзяленнях агульнай, гнойнай хірургіі ды колапракталогіі. Прафесар С.А.Аляксееў з’яўляецца навуковым кансультантам доктарскай дысертацыі дацэнта Дзеркачова В.С. па тэме «Диагностика, прогнозирование, лечение и профилактика гнойно-воспалительных осложнений у пациентов с посттравматическим остеомиелитом».

Прафесар С.А.Аляксееў з’яўляецца навуковым кіраўніком:

- кадыдацкай дысертацыі аспіранта Клімук С.А. «Способы прогнозирования и методы комплексного лечения рожистого воспаления»,
- кадыдацкай дысертацыі аспіранта Жылінскага Е.В. «Прогнозирование, ранняя диагностика витально опасных осложнений ожоговой болезни и методы их комплексного лечения»,
- сушукальніка Олесюка Д.В. – “Оценка нарушений ПОЛ и принципы озонпрессивных технологий в лечении пациентов с механической желтухой”,
- сушукальніка Дудко А.А. - “Малоинвазивные и озонпрессивные методы лечения острого панкреатита”.

Прафесар Рычагоў Г.П. з’яўляецца навуковым кіраўніком:

- Новікава С.В., асістэнта кафедры агульнай хірургіі «Хирургическое лечение рецидивных и послеоперационных вентральных грыж»;
- Мукавозавай И.Л. - сушукальніка кафедры агульнай хірургіі “Эндоскопическое лечение ворсинчатых опухолей толстой кишки больших размеров”
- Вальчука А.А. – сушукальніка кафедры агульнай хірургіі “Патогенетические подходы лечения паховых грыж”

Прафесар Бардакоў В.Н. з’яўляецца навуковым кіраўніком сушукальніка Савіцкага Д.Я. «Современные методы гемостаза при паренхиматозных кровотечениях»

Акрамя таго, ў апошнія гады актывізавалася праца па падрыхтоўцы новых сучасных падручнікаў для спецыялістаў медычнага профіля. Прафесар Аляксееў С.А. заканчвае працу над новым падручнікам па агульнай хірургіі, над навучальным дапаможнікам по хіругічным хваробам для студэнтаў медыка-прафілактычнага і стаматалагічнага факультетаў, ассістэнты Новікаў С.В. і Клімук С.А., дацэнт Кашэўскі П.П. - над блокам метадычных дапаможнікаў для навучэння студэнтаў на ангельскай мове.

Супрацоўнікі кафедры пастаянна удасканальваюць свае веды і уменні, стажыруюцца ў Рэспубліцы Беларусь і за мяжой, наведваюць з’езды ды канферэнцыі рознага узроўню.












Навучальныя дапаможнікі і падручнікі кафедры




Аперыруе прафесар С.А.Алексееў



Калектыў кафедры, 2017 год. Стаяць дацэнты М.Я.Бовтюк, А.І.Лемешэўскі, І.Д.Семенчук, В.А.Гінюк, О.В.Папкоў, П.П.Кашэўскі. Сідзяць: дацэнт А.А.Безвадзіцкая, загадчык кафедры прафесар С.А.Алексееў, асістэнт С.А.Клімук, лабарант Л.І.Сапленкова, клінічны ардынатар Рабі Ібрахім.



Тэставанне ў групе ангельскамоўных студэнтаў




Абарона магістэрскай дысертацыі